**Правы чалавека ў Беларусі. Моладзь супраць смяротнага пакарання?**

*Справаздача па праекце аб грамадзянскім непадпарадкаванні ва Усходняй Еўропе*

У рамках нашых даследаванняў у Інстытуце ўсходніх даследаванняў еўрапейскага Свабоднага ўніверсітэта Берліна, мы правялі праект на тэму «Грамадзянскае непадпарадкаванне? Дзяржава і грамадства ва Усходняй Еўропе». Наша мэта ў тым, каб высветліць, у якой меры існуюць грамадскія рухі ў Беларусі - краіне, якая лічыцца аўтарытарнай дзяржавай. Акрамя таго, мы хацелі б ведаць, ці магчыма грамадзянскае непадпарадкаванне ў такой краіне як Беларусь.
У 2014 годзе наш праект у асноўным быў засяроджаны на становішчы з правамі чалавека ў Беларусі, у першую чаргу на праблеме смяротнага пакарання. Беларусь з'яўляецца адзінай еўрапейскай краінай, якая дасюль прыводзіць у выкананне смяротныя прысуды. Таму паўстала пытанне, якія прычыны ёсць для таго, каб захоўваць смяротнае пакаранне. Важнай часткай нашага даследавання была роля грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Мы хацелі высветліць, ці ёсць грамадзянскія арганізацыі, рухі ды ініцыятывы, якія змагаюцца за адмену смяротнага пакарання. Апошняй буйнай часткай праекта быў аналіз агульнага меркавання насельніцтва Беларусі. Мы вырашылі, што было б больш цікава даследаваць погляды маладых беларусаў, меркаванне якіх дагэтуль не ўключалася ў статыстыку. Мы правялі апытанне сярод студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні. У ходзе нашага даследавання мы таксама атрымалі магчымасць сустрэцца з беларускім студэнтам у Германіі і маладымі беларусамі ў адной з трох летніх школаў, арганізаваных праваабарончай арганізацыяй «Вясна». Для нас было важна сустрэцца з гэтай арганізацыяй, працуючы над нашым праектам на працягу апошняга года, паколькі «Вясна» з'яўляецца найбуйнейшай і найбольш вядомай беларускай праваабарончай арганізацыяй. Нам было цікава пагаварыць з актывістамі «Вясны», таму мы вырашылі сустрэцца з імі ў ліпені 2014 года.

**Міжнародныя дакументы па адмене смяротнага пакарання vs. Рэферэндум 1996 года ў Беларусі**

У 1953 годзе дэкларацыя Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека пакінула адкрытым пытанне пра смяротнае пакаранне. З тых часоў пытанне захавання або адмены смяротнага пакарання вырашалася кожнай суверэннай еўрапейскай дзяржавай. У ЕКПЧ 1953 года не было адназначна напісана, што смяротнае пакаранне павінна быць адмененае. Тым не менш, Канвенцыя была дапоўненая дадатковымі пратаколамі, якія забараняюць выкарыстанне смяротнага пакарання ў мірны час. У 2003 годзе быў абвешчаны яшчэ адзін

пратакол у падтрымку безумоўнай адмены смяротнага пакарання, незалежна ад таго, пра які час – мірны або ваенны – ідзе гаворка. Таму Еўрапейская Канвенцыя па правах чалавека з'яўляецца важным дакументам, які павінен падтрымаць канчатковую адмену смяротнага пакарання ў Беларусі. Праблема ў тым, што гэты дакумент не быў ратыфікаваны Беларуссю і таму не мае юрыдычнай сілы для беларускага ўрада.

Адзіным міжнародным дакументам, які Беларусь падпісала і які датычыцца пытання аб смяротным пакаранні, з'яўляецца Міжнародны Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Але гэты дакумент таксама пакінуў адкрытым пытанне аб смяротным пакаранні, і, такім чынам, дазволіў вырашаць яго кожнай дзяржаве. З моманту прыняцця МПГПП былі зробленыя важныя крокі дзеля таго, каб унесці змены ў гэты Пакт і падтрымаць канчатковую адмену смяротнага пакарання ва ўсім свеце. Дадатак да МПГПП у выглядзе Другога Факультатыўнага пратакола быў створаны ў снежні 1989 года; ён абавязаў удзельнікаў дамовы адмяніць смяротнае пакаранне ў сваіх межах. Другі Факультатыўны пратакол таксама не быў ратыфікаваны Беларуссю.

Але чаму Беларусь не імкнецца падпісваць такія дакументы? Па якіх прычынах Аляксандр Лукашэнка і ўрад Беларусі ра-ранейшаму адстойваюць захаванне смяротнага пакарання ў краіне? Улады часта спасылаюцца на вынікі рэферэндума 1996 года, паводле якога 80% насельніцтва Беларусі прагаласавала за смяротнае пакаранне. Вось чаму Лукашэнка па-ранейшаму выкарыстоўвае рэферэндум як легітымізацыю неабходнасці захавання смяротнага пакарання ў Беларусі. Праблема ў тым, што на рэферэндуме 1996 г. насельніцтва Беларусі прымала рашэнні не толькі па пытанні смяротнага пакарання, але і па іншых пытаннях, такіх як перанос Дня Незалежнасці, зямельная рэформа і г.д. Паводле Беларускага Хельсінкскага камітэта, гэты рэферэндум парушыў міжнародныя стандарты і нормы. Гучалі абвінавачванні ў маніпуляцыях напярэдадні рэферэндума. Яшчэ адной сур'ёзнай і яшчэ большай праблемай стала недастатковае грамадскае абмеркаванне або адсутнасць інфармацыі пра сутнасць смяротнага пакарання. Беларускія СМІ кантралююцца і залежаць ад дзяржавы, таму непрыемныя або складаныя тэмы, як смяротнае пакаранне, не абмяркоўваюцца адкрыта.

**Меркаванні студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні наконт сітуацыі з правамі чалавека і смяротнага пакарання ў Беларусі**

Паводле вынікаў апытання сярод 30 беларускіх студэнтаў, праведзенага намі з дапамогай апытальніка, моладзь ведае аб праблемным прававым становішчы ў Беларусі. Яна лічыць 1990-я цяжкімі часамі, парой злачыннасці, палітычных ды эканамічных крызісаў. Большасць беларусаў былі ўпэўненыя, што падтрымка смяротнага пакарання на рэферэндуме 1996 года гарантавала бяспеку.

Цікава адзначыць меркаваную змену грамадскай думкі адносна смяротнага пакарання пасля вынясення прысуду Канавалаву і Кавалёву ў 2011 годзе. Для многіх беларусаў незразумела, ці двое абвінавачаных у тэракце метро былі сапраўды вінаватыя. Інтэрнэт застаецца адзіным месцам, дзе беларусы маюць магчымасць знайсці розныя меркаванні і звесткі па праваабарончай тэматыцы. Згодна з вынікамі апытання студэнтаў можна зрабіць выснову, што адмена смяротнага пакарання ў Беларусі мае быць справай урада. На справе, змена ўрада можа мець станоўчы ўплыў на становішча з правамі чалавека, але малаверагодна, што такія змены могуць прывесці да адмены смяротнага пакарання. Апытаныя студэнты лічаць, што адмена смяротнага пакарання таксама залежыць ад насельніцтва і працы праваабарончых арганізацый, без якіх немагчыма абараняць і падтрымліваць правы чалавека.
Тым не менш, ёсць толькі невялікая група арганізацый Беларусі, якія клапоцяцца пра паляпшэнне становішча з правамі чалавека. У Беларусі праваабарончыя арганізацыі і грамадзянская супольнасць часта звязваюцца з апазіцыяй, што адразу выклікае падазрэнне з боку насельніцтва. Тым не менш, большасць рэспандэнтаў заявілі і перакананыя, што грамадзянская супольнасць можа быць ключом хаця б да захавання мінімуму свабодаў. Устойлівае ўзмацненне грамадзянскай супольнасці залежыць ад адукацыйных прапановаў і фінансавай падтрымкі з боку міжнародных арганізацый.

**Падзел меркаванняў моладзі наконт становішча з правамі чалавека ў Беларусі**

Беларускую моладзь можна падзяліць на дзве групы. Існуе велізарная большасць, якая атрымлівае звесткі аб становішчы з правамі чалавека з альтэрнатыўных сродкаў масавай інфармацыі, у асноўным у Інтэрнэце, і задумваецца аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Беларуская моладзь у агульным адкрытая да альтэрнатыўных спосабаў мыслення. Існуе высокая колькасць студэнтаў, якія карыстаюцца адукацыйнымі прапановамі за мяжой, асабліва ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Вільнюсе (Літва). У агульным, студэнты ЕГУ ведаюць аб дзяржаўнай ідэалогіі ў галіне адукацыі і спрабуюць супрацьстаяць ёй, паступаючы ў Вільню. 80% студэнтаў ЕГУ - беларусы.
Другая група паводзіцца даволі пасіўна і жадае не мець ніякага дачынення да палітыкі і грамадскіх праблем. Важна падкрэсліць, што гэтая пасіўнасць не звязаная з узроўнем асветы. Можна назіраць велізарную незацікаўленасць і абыякавасць да асаблівага беларускага становішча з правамі чалавека сярод маладых студэнтаў. Многія лічаць, што Беларусь мае іншыя сур'ёзныя праблемы, найперш у сацыяльна-эканамічным дачыненні. Для іх больш важная барацьба з беспрацоўем і забеспячэнне матэрыяльнага дабрабыту ды

бяспечнага існавання. Перш чым імкнуцца да ліберальных каштоўнасцяў, неабходна задаволіць асноўныя патрэбы. Гэтыя каштоўнасці падаюцца малаадчувальнымі і няважнымі. Гэтая пасіўнасць суправаджаецца апатыяй да палітыкі. Многія маладыя беларусы лічаць, што ў найбліжэйшай будучыні не будзе палітычных зменаў. Знаходжанне Лукашэнкі ва ўладзе цягам больш чым двух дзесяцігоддзяў прывяло да няверы ў магчымасць пераменаў у пазіцыі ўлады. Частка беларускай моладзі ўспрымальная да лукашэнкаўскай прапаганды, не ставіць пад сумнеў, у якой ступені прапагандысцкая аргументацыя з'яўляецца апраўданай. Больш за тое, заяўляецца, што смяротнае пакаранне з'яўляецца разумным, паколькі ў адваротным выпадку пажыццёвае пазбаўленне волі будзе каштаваць занадта шмат, і, такім чынам, будзе дадатковым выдаткам з падатковых паступленняў.

**Праца праваабарончай арганізацыі «Вясна»**

Мы атрымалі магчымасць сустрэцца з некаторымі супрацоўнікамі ды актывістамі «Вясны». Мы сапраўды былі ўражаныя іх адданасцю справе паляпшэння становішча з правамі чалавека ў Беларусі. Адна з самых важных задачаў «Вясны» – падтрымка несправядліва асуджаных або прысуджаных да смяротнага пакарання па палітычных ці іншых прычынах. «Вясна» знаходзіць спосабы забяспечыць матэрыяльную і юрыдычную дапамогу зняволеным ды іхнім  сем'ям. Яшчэ адной важнай часткай працы «Вясны» з'яўляецца інфармаванне і асвета людзей па праваабарончай тэматыцы.
З 2009 года праводзіцца кампанія супраць смяротнага пакарання, распачатая «Вясной», Беларускім Хельсінкскім камітэтам і Amnesty International. Асноўнай задачай гэтай кампаніі з'яўляецца распаўсюд звестак дзеля павышэння абазнанасці па гэтай тэме ў беларускім грамадстве. Нам было цікава пачуць, што самым вялікім дасягненнем для іх ёсць грамадскае абмеркаванне гэтай кампаніі і што ёсць прыхільнікі і ўдзельнікі гэтай кампаніі, якія маюць розныя палітычныя погляды. Яны звязаныя не палітычнымі поглядамі, але жаданнем і неабходнасцю адмены смяротнага пакарання - бесчалавечнага інструмента, які выкарыстоўваецца дзеля запалохвання грамадства. Унёсак «Вясны» ў інфармаванне і асвету насельніцтва Беларусі няўхільна павышаецца з часу арганізацыі Летняй школы па правах чалавека, якая праводзіцца штогод, пачынаючы з 2008 года.

**Моладзь супраць смяротнага пакарання?**

Адзін з удзельнікаў кампаніі супраць смяротнага пакарання, **Андрэй Палуда**, паясняе, што смяротнае пакаранне з'яўляецца вельмі эмацыйнай тэмай. Пасля прагляду фільмаў аб смяротным пакаранні людзі пачынаюць задумвацца і выступаць супраць яго. Калі ўрад прадстаўляе матэрыял аб смяротным

пакаранні, людзі, як правіла, знаходзяць прычыны для падтрымкі смяротнага пакарання. Гэта моцна залежыць ад спосабу прадстаўлення інфармацыі. У гэтым выпадку акцэнт вельмі змяняецца і можа надзвычайна паўплываць на грамадскае меркаванне. Пры праглядзе тэматычных фільмаў урада няма ніякіх дыферэнцыраваных разважанняў па гэтай тэме. Унутраны працэс адсутнічае, што азначае, што спасылкі на каштоўнасці, здаровы сэнс і палітычныя перакананні наўмысна апускаюцца. Ключавым момантам ажыццяўлення смяротнай кары з'яўляецца тое, што яна ажыццяўляецца не адным чалавекам, але залучае многіх іншых: юрыстаў, суды, а таксама грамадства. У нашых інтэрв'ю і гутарках з маладымі беларусамі ў праваабарончай школе ў Вільні мы не раз чулі, што старэйшае пакаленне, г.зн. пакалення Савецкага Саюза, усё яшчэ мае адрозныя каштоўнасці і меркаванні. Яны былі сацыялізаваныя адрозна і дасюль жывуць паводле савецкіх ідэй. Іх меркаванні цяжка або немагчыма змяніць. Для актывістаў «Вясны» больш цікава працаваць з моладдзю, якая адкрытая для альтэрнатыўных меркаванняў. Андрэй Палуда таксама адзначыў, што ў пачатку правядзення праваабарончых школ у іх бралі ўдзел толькі тыя, хто ўжо меў уяўленне аб правах чалавека ў Беларусі. Цяпер ёсць маладыя людзі з розным жыццёвым досведам і цікавасцямі, адукацыяй і ведамі, датычнымі пытанняў правоў чалавека. Але яны цікаўныя і прагнуць даведацца больш аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі. Яны не прымаюць таго, што доступ да некаторых ідэй і думак не дапускаецца з ідэалагічных прычынаў. Нашы назіранні паказалі, што моладзь, здаецца дастаткова адважнай, каб ставіць пад пытанне розныя структуры свайго паўсядзённага жыцця. Яны маюць магчымасць падарожнічаць і таму адкрытыя для іншых спосабаў жыцця. Маладыя людзі ў Беларусі, як і любая іншая моладзь у любой іншай краіне, фармуюць будучыню. Ад іх залежыць, у якім кірунку можа рухацца і змяняцца Беларусь дзеля лепшай будучыні. Андрэй Палуда поўны спадзеваў, што Беларусь будзе мяняцца да лепшага, і мы спадзяемся на гэта разам з ім. Палуда сцвярджае, што калі б ён не меў надзеі, то яму было б вельмі цяжка змагацца з такім грамадскім недахопам.

У заключэнне мы маем сказаць, што ёсць вялікі патэнцыял сярод беларускай моладзі, якая можа ўмацаваць беларускую грамадзянскую супольнасць і падтрымаць адмену смяротнага пакарання.